УДК 811.161.3:378.147.091.313

# Філаматы і філарэты: да праблемы рэвіталізацыі памяці ў свядомасці сучаснага маладога пакалення

Гіруцкая Л. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Нягледзячы на невялікую колькасць гадзін, прадугледжаных вучэбнымі планамі факультэтаў на дысцыпліну “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” і дамінаванне прафесійна арыентаванай накіраванасці яе выкладання ў тэхнічнай ВНУ, сам прадмет курса ў любым выпадку самой назвай і зместам падразумявае значнае месца выхаваўчага рэсурсу. Так, пры вывучэнні гістарычных этапаў развіцця беларускай мовы непазбежна звяртаецца ўвага на ролю дзейнасці арганізацыі філаматаў, яе асобных членаў у фарміраванні новай (нацыянальнай) беларускай літаратурнай мовы, беларускага мовазнаўства і фалькларыстыкі. На жаль, высвятляецца, што, хоць студэнтам і знаёмыя само словазлучэнне “Таварыства філаматаў і філарэтаў”, прозвішчы Яна Чачота, Адама Міцкевіча, зрэдку Ігната Дамейкі, веды гэтыя вельмі павярхоўныя і прыблізныя, згаданыя асобы далёкія і, скажам прама, чужыя. Між тым ва ўсе часы маладыя людзі маюць патрэбу ў маральных ідэалах, у сваіх нацыянальных героях, якіх яны могуць шчыра паважаць, да якіх імкнуцца быць падобнымі. На нашу думку, менавіта жыццё, дзейнасць, творчасць равеснікаў нашых навучэнцаў, нягледзячы на двухсотгадовую аддаленасць, заслугоўваюць актыўнай рэвіталізацыі ў памяці сучаснай беларускай моладзі. Што ж можа быць актуальным і прынцыпова важным для нашых навучэнцаў? Напрыклад, можна паразважаць над лозунгам філаматаў: “Не возьмем мы хцівасць ва ўжытак, Прэч, сквапнасці, пыхі насенне! Наш самы высокі набытак – Айчына, навука, сумленне” (А. Міцкевіч, бел. пер. К. Цвіркі). Напэўна, дзіўнай сучаснаму студэнту можа здацца і першапачатковая мэта Таварыства – маральнае ўдасканаленне і ўзаемадапамога ў набыцці адукацыі. На сваіх пасяджэннях філаматы чыталі свае навуковыя працы, рабілі агляды прэсы, а паколькі былі людзьмі маладымі, то многія пасяджэнні праводзілі ў форме маёвак, да якіх складалі сцэнарыі, сачынялі і развучвалі песні, драматычныя сцэнкі, рабілі ўсё, каб вабіць час карысна, цікава, прыгожа і весела. І зараз адукаваных маладых людзей займаюць вечарынкі этнаграфічныя вандроўкі, музычныя салоны, культурна-асветніцкія праекты. І 200 гадоў таму добра разумелі, што, каб быць адукаваным, трэба ведаць некалькі замежных моў, і філаматы ў дадатак да таго, што вывучалася ва ўніверсітэце, арганізавалі курсы для вывучэння англійскай і нямецкай моў, добра ведалі і французскую мову, а латынь увогуле вывучалі яшчэ ў школе.